Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАШ ГОЛАС

Выходаіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адраса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№. 3 — Вільня, Аўторак, 1-га лютага 1927 г. — Год I

Першы нумар нашае газэты з 26-га студзеня с. г. сканфіскаваны па загаду камісара ўраду на м. Вільню за зьмяшчэньне ў ім стацей: „ШТО РАБІЦЬ?“ „У ЧЫМ ВІНАВАЦЯЦЬ НАШЫХ ПАСЛОЎ?“ і карэспандэнцыі з Варшавы „Далейшая праграма абшарнікаў“.

Так сама сканфіскаваны і № 2 нашае газэты з 28 студзеня за перадавую стацьцю „БУРЖУАЗНАЯ МАРАЛЬНАСЬЦЬ“ і прапушчаны цэнзурай у папярэднім нумары адказ газэце „Дзеннік Віленьскі“ пад загалоўкам „НЕ ЗАБАРАНЯЮЦЬ“.

Адначасна сканфіскаваны № 3 газэты „НАРОДНЫ ЗВОН“ (лацінікай) з 28 студзеня за перадавую стацьцю „ДА КУЛЬТУРНАЕ ПРАЦЫ“, а так сама за „АДКАЗ БЕЛАРУСКАЙ КРЫНІЦЫ і СЯЛЯНСКАЙ НІВЕ“, ды за рад рэзалюцыяў беларускіх грамадзкіх установаў у справе арыштаў беларускіх дзеячоў. Усе гэтыя рэзалюцыі былі ўжо надрукаваны ў № 7 „Нашае Справы“ і ня былі сканфіскаваны.

* * *

Нашу перадавіцу ў папярэднім нумары пад загалоўкам „Буржазная маральнасьць“, дзе мы далі агульнае запярэчаньне ўсім брахлівым закідам, робленым Польскай буржуазнай прэсай нашым паважаным грамадзкім дзеячом і ідэйным павадыром, улада сканфіскавала. Дзеля гэтага зьмяшчаем на гэтым мейсцы два запярэчаньні жонак пакрыўджаных дзеячоў, надрукаваныя ўжо ў №№ 18 і 22 „Кур. Віл.“ і не сканфіскаваныя паліцыяй. Яны даюць меру таго, на што пазваляюць сабе ў адносінах да нашых павадыроў польскія буржуазныя газэты.

Пісьмо грам. Астроўскай.

Паважаны Пане Рэдактар! У сувязі з арыштамі, зробленымі ў апошнім часе на палітычным грунце сярод палітычных дзеячоў, аказаўся пазбаўленым волі такжа і мой муж, Радаслаў Астроўскі, дырэктар беларускае гімназіі ў Вільні і сябра дырэкцыі Беларускага Каапэратыўнага Банку. Факт гэты нясумленна выкарыстала рэдакцыя газэты „Слово“, якая—пэўная свае бяскарнасьці—пазволіла сабе зрабіць нягодную напасьць на мужа майго, пазбаўленага магчымасьці ўразжа зарэагаваць асабіста на дазнаную крыўду. Іменна, у № 13 „Слова“ з 18 студзеня была надрукавана заметка пад загалоўкам „Шпіён і злодзей“, у якой „Слово“ заяўляе, быццам на дапросе Радаслаў Астроўскі прызнаўся да нібы-то зробленай ім кражы ў Амэрыканскім Камітэце, да таго, што на складкі гурткоў Грамады і Беларускага Каапэратыўнага Банку пабудаваў сабе ў Каляёвай Калёніі „вільлю“, і гэтак далей.

Вось-жа, што датыча істоты гэнага агіднага паклёпу, кінутага на мужа майго, дык далучаныя дакумэнты (ў копіях) бароняць добрую славу, яго, як былага інспэктара палескага раёну ў Берасьці Амэрыканскага Ратунковага Аддзелу і Польска Амэрыканскага Камітэту Помачы Дзяцям (дыплём з падзякай за працу з 1-га чэрвеня 1922 году з подпісамі Гэрбэрта Гувэра, Эдгара Рыккарда, В. Л. Броўна, М. Пат'а П. С. Бальдвіна—кіраўнікоў памянутых установаў). — Што-ж да дому ў Каляёвай Калёніі, дзе я жыву з мужам і дзяцьмі, дык гэта мая асабістая ўласнасьць, і пабудаваны гэты дом на падставе дадзенага мне Будаўляным Аддзелам пры Магістраце м. Вільні дазволу з 12-га лютага 1926 году № 19 — за мае ўласныя грошы, якія я атрымала пры прадажы майго фальварку Радотоль, у Шэрэшэўскай гм., Пружанскага пав., (акт прадажы з 4-га лютага 1926 году зроблены ў натарыуса В. Кавалеўскага ў Пружане—рэпэрторыум № 229). Паставіўшы гэтыя даты побач з датамі пачатку дзейнасьці Беларускага Каапэратыўнага Банку (лістапад 1925 году) і пачатку арганізацыі гурткоў Грамады (пасьля маёвага перавароту 1926 году), выяўляецца ўся злая воля аўтараў агіднае напасьці на майго мужа, якія — ня маючы доказаў палітычнага праступку яго — хочуць абясславіць яго, як грамадзкага дзеяча і грамадзяніна, шляхам зласьлівага закіданьня яму нібы-то крымінальных праступкаў.

Кіруючы справу ў суд, прашу адначасна падаць да агульнага ведама вышэйсказанае на страніцах Вашае шырока-чытанае часопісі.

(—) А. Астроўская.

Вільня, 22 студзеня 1926 г.

Увага Рэдакцыі „Кур. Віл.“: Да гэтага пісьма далучаны копіі дакумэнтаў, пералічаных у пісьме.

Пісьмо грам. Каўшовай.

Паважаны Пане Рэдактар! З найвялікшым задзіўленьнем прачытала я ў цэлым радзе газэт заметку аб нібы-то „бальшавіцкім“ прошлым мужа майго, а. Аляксандра Каўша, сябры дырэкцыі Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні. Паводле гэнае заметкі, муж мой быццам-то займаў у 1921 годзе становішча начальніка чрэзвычайкі ў Растове над Донам, а ў 1922 годзе — начальніка чрэзвычайкі ў Екацерынбургу, а ў 1923 годзе—кіраўніка курсаў для інструктароў і агітатараў у Маскве.

Гэтым сцьвярджаю, што муж мой у 1919 і 1920 гадох жыў у Славянску і Майкопе, выпаўняючы абавязкі бухгальтэра ў тамтэйшым аддзеле расейскага дзяржаўнага банку — за гаспадараньня Дэнікіна, а пасьля—у 1921 годзе — на падставе пасьведчаньня паўнамоцніка польскага консульства кс. Мікалаюна, як ураджэнец Горадзеншчыны, прыехаў у Польшчу, межаў якое не пакідаў ні на адзін дзень, выпаўняючы ў в. Дзятлавічах Ваўкавыскага пав. абавязкі прыходзкага сьвяшчэньніка. Высьвяньціўся ён 7 лютага 1922 году. З Дзятлавіч прыехаў беспасрэдна ў Вільню ў 1926 годзе.

Гэтыя дадзеныя магу падцьвярдзіць асабіста на падставе існуючых у мяне дакумэнтаў (пасьведчаньне кс. Мікалаюна з 1 красавіка 1920 году № 74, а так-жа акт высьвяшчэньня з 7 лютага 1922 году № 205, выданы горадзенскім біскупам Уладзімерам). Падцьвярдзіць гэта могуць такжа адміністрацыйныя ўлады Ваўкавыскага павету і духоўныя ўлады мужа майго.

(—) Альжбета Коўш.

Вільня, 25 студзеня 1927 г.

Увага Рэд. „Кур. Віл.“: У сувязі з гэтым пісьмом п. Коўш паказала нам арыгіналы дакумэнтаў, сцьвярджаючых вышэйпададзенае.

Ксяндзоўская „Беларуская Крыніца“ ў апошнім № 5 з 28-га студзеня, роняючы кракадзілавы сьлёзы „ў цяжкую гадзіну“ для беларускага руху, далей чыста па-езуіцку цкуе ўладу на Грамаду, закідаючы ей „камунізм“. У перадавіцы сказанага нумару газэты знаходзім гэткую „красачку“:

„Наш селянін пайшоў туды (—у Грамаду!— *Рэд.*) не праз сымпатыю да камунізму, а праз ненавісьць да Польшчы“.

Дык у Грамадзе нашы „айцы духоўныя“ ўсё-ж такі бачаць „камунізм“? — А вось навет польскі ўрад гэтага ня кажа, вінавацячы толькі павадыроў Грамады ў зносінах з камуністамі і супрацоўніцтве з імі!...

Ня менш цікаўную пазыцыю заняла „Сялянская Ніва“ — орган „сельсаюзьнікаў“: друкуючы нягодныя стацьці аб нейкай „правакацыйнай“ ролі Грамады, гэная кумпанія аднячасна ўдае нібы-то „абаронцаў“ заарыштаваных беларускіх дзеячоў, ведаючы, што іх абарона ніякага выніку пэўне ж ня дасьць. Але „сельсаюзьнікі“ хочуць гэткім спосабам здабыць прыхільнасьць масаў сялян і работнікаў, згуртаваных у Грамадзе, ды заняць месца заарыштаваных павадыроў Грамады.

Ну, гэта дык напэўна ня ўдасцца: ведаюць усе, што такое „Сялянскі Саюз“ і якім багам служаць ягоныя тварцы! Ня могуць працоўныя верыць тым, што разьбіваюць еднасьць сялян і работнікаў, каб на калатні паміж гэтымі асноўнымі часткамі берарускага народу рабілі сваю палітычную кар'еру розныя палітычныя спэкулянты!

Справа нашых паслоў у Сойме.

У панядзелак, 24 студзеня, маршалак Сойму Ратай, ламаючы соймавы наказ, хацеў правясьці выдачу заарыштаваных беларускіх паслоў суду праз соймавую камісію—без перадачы ей справы самім Соймам, чаго вымагае наказ. Гэтак марш. Ратай маніўся ўжо ў аўторак правясьці рэзалюцыю камісіі праз паседжаньне Сойму і хутчэй „улегалізаваць“ недапушчальнае па Канстытуцыі трыманьне паслоў у вастрозе бяз згоды ўсяго Сойму ці хаця-бы маршалка яго.

З прычыны пратэсту аднаго з беларускіх паслоў, прысутнага на паседжаньні камісіі, гэта марш. Ратаю не ўдалося. Дык у аўторак ён мог толькі зрабіць Сойму даклад аб дамаганьні ўрадам выдачы паслоў. Ведама, Сойм, як і трэба было спадзявацца, прыняў урадавую прапазіцыю пакіраваць справу ў камісію,—аднак не абыйшлося без пратэстаў.

Як падае ПАТ, пасьля дакладу марш. Ратая выступіў з прамовай адзіны пасол Грамады, які астаўся на волі, Сабалеўскі, пратэстуючы проці арышту паслоў, проці напасьцяў на нацыянальныя меншасьці і проці пагрому Беларускае Сялянска - Работніцкае Грамады. Пасол Сабалеўскі запрапанаваў, каб Сойм прыняў пастанову аб звальненьні заразжа ўсіх заарыштаваных паслоў.

У часе прамовы Сабалеўскага марш. Ратай некалькі разоў прызываў яго да парадку.

Другі прамаўляў проці выдачы паслоў пасол Сахацкі (камуніст), прапануючы Сойму выказаць свае недаверые ўсяму ўраду марш. Пілсудскага.

Марш. Ратай заявіў, што ня можа паставіць на галасаваньне прапазыцыю пасла Сабалеўскага па фармальным прычынам. Прапазыцыя-ж пасла Сахацкага можа быць разгледжана толькі на адным з наступных паседжаньняў Сойму.

Тады ў салі паседжаньня Сойму, як падае „Слово“, узьнялася бура на левых лавах. Пачаліся крыкі пратэсту. Асабліва востра выступіў пасол Воевудзкі (Н П Х), якога маршалак за вострыя словы выключыў на месяц з засяданьняў Сойму. Пасол Воевудзкі адмовіўся выйсьці. Паседжаньне было прыпынена, і маршалкоўская варта вынесла пасла Воевудзкага на руках.

Пры галасаваньні ўрадавае прапазыцыі, у абароне якой выступіў віцэ-прэм'ер Бартэль (былы калега па Вызваленьню арыштаванага аднячасна з нашымі пасламі пасла Галавача!), — за скіраваньне справы ў камісію была пададзена большасьць галасоў.

Характэрна, што ў сваей прамове віцэ-прэм'ер Бартэль назваў заарыштаваных паслоў—выбранцаў беларускага народу — „няпрошанымі апякунамі“ беларускага народу... Цікаўна: хто-ж, на яго пагляд, зьяўляецца „прошаны“?!...

Паседжаньне соймавае камісіі было вызначана на сераду, у 10 гадз. раніцы, з тым, каб у той-жа дзень у 12 гадз. мог сабрацца ўвесь Сойм і прыняць пастанову аб выдачы суду ўсіх заарыштаваных паслоў.

Паседжаньне камісіі дзеля разгляду справы аб выдачы суду заарыштаваных беларускіх паслоў адбылося ў сераду. На жаданьне мін. Мэйштовіча, паседжаньне было аб'яўлена тайным, і гэтак грамадзянства аказалася пазбаўленым магчымасьці даведацца запраўдныя прычыны арышту.

Пасьля дакладу мін. Мэйштовіча паасобныя паслы задавалі яму пытаньні, на якія ён даваў дадатковыя тлумачэньні. Справа, аднак, у адзін дзень, як спадзявалася ўрадавая прэса, не закончылася.

За дакладчыка на пленум Сойму выбраны эндэк пас. Добжаньскі.

Чароднае паседжаньне адбудзецца ў чацьвер, 3 лютага.

Гэтак справа зацягіваецца.

Выступленьне проці пасла Воевудзкага.

Блізкая да ўраду Пілсудскага газэта „Głos Prawdy“ выступіла проці пасла Воевудзкага (павадыра Незал. Партыі Хлопскай) з абвіненьнем, што ён у 1923 годзе, яшчэ як сябра „Вызваленьня“, супрацоўнічаў з II аддзелам генаральнага штабу, інфармуючы аб настроях сярод беларусаў.

Як ведама, пас. Воевудзкі быў некалі шчырым „Пілсудчыкам“ і ў часе акупацыі Менску, як польскі афіцэр, быў назначаны ў склад II аддзелу (дэфэнзывы). Аднак, пабыўшы ў Сойме, як пасол ад „Вызваленьня“, ён рэзка разышоўся з „Вызваленьнем“ і наагул з пілсудчыкамі, стварыўшы вельмі радыкальную і варожую да ўраду партыю „Н. П. Х.“ У сувязі з арыштамі грамадаўскіх паслоў Воевудзкі заняў вельмі апазыцыйнае да ўраду становішча і за рэзкія выступленьні проці міністра Мэйштовіча быў выдалены маршалкам на месяц з паседжаньняў Сойму.

Сярод урадавых партыяў істнуе імкненьне выдаліць Воевудзкага з Сойму зусім. Працу яго ў II аддзеле, хоць яе пасьля зрокся, лічаць для пасла Сойму ганьбячай.

Жыдоўская і літоўская прэса аб арыштах Беларусаў.

У дні цяжкіх udaраў найлепш можна пазнаць прыяцеляў.

Пад той час, як уся польская прэса—згодна, па каманцэ зьверху — бясчэльна лгала аб выкрытых „складах аружжа“, „бальшавіцкіх цыркулярах“, „тысячах даляраў“, якія знойдзены быццам-то ў гуртках Грамады і ў паслоў,—у той час, як „свае“—хадэкі і сельсаюзьнікі — пісалі ўсялякія подласьці аб арганізацыі беларускіх сялян і работнікаў, да фізычных udaраў варожае рукі далучаючы яд маральны, — у той час прэса народаў, якія пад Польшчай маюць мала лепшае жыцьцё, чым нашае, горача адгукнулася і выразіла свой шчыры спогад да нас.

Найбольш прыхільнай аказалася жыдоўская прэса. У жыдоўскіх газэтах, выдаваных у жыдоўскай і польскай мове, зьявіліся першыя стацьці і заметкі, асьвятляючыя праўдзіва справу арыштаў і выяўляючыя той удар, які зроблены не камунізму, а—пад відам барацьбы з камунізмам—беларускай нацыянальнай справе наагул. Толькі праз жыдоўскія газэты ў польскай мове, не далучыўшыяся да ганебнае змовы польскіх рэдактароў проці беларусаў—пад камандай дэфэнзывы,—магло і польскае грамадзянства даведацца праўду аб усей справе.

Лішне доўга было-б пералічаць галасы жыдоўскае прэсы ў абарону беларусаў. Мы абмяжуемся адно толькі выступленьнем у віленскай газэце „Цайт“ пасла д-ра Выгодскага, дужа далёкага ад нас па свайму сацыяльнаму становішчу. Д-р Выгодскі, як стары палітычны дзеяч, лішне добра разумее, што ў гэты мамэнт Польшча, б'ючы беларусаў, гэтым самым аслабляе адпорную сілу „нацыянальных меншасьцяў“ наагул, ды што за намі можа прыйсьці чарга і на жыдоў. І вось, што ён піша ў стацьці **„Беларуская небясьпека“ ў Віленшчыне.**

Перадусім д-р Выгодскі адзначае, што выяўленьне магутнага нацыянальнага руху сярод беларусаў пад Польшчай—гэта адказ на варожую да іх палітыку польскага ўраду. Мінулі ўжо часы, калі можна было перарабляць нацыянальнасьці на свой капыл, аб чым пара ўжо пераканацца польскім палітыкам. Пажар, які ўзьняўся на тэрыторыі Заходняе Беларусі, можа быць затушаны ня крывёй і сьлязмі, а вялікімі і справядлівымі рэформамі як у галіне зямельных адносінаў, так і нацыянальных, у вёсцы і ў месьце. Аўтар трэбуе, каб марш. Пілсудскі паклаў у аснову новае нацыянальнае палітыкі на нашых землях тэрыторыяльную аўтаномію для беларусаў і культурна-нацыянальную—для жыдоў. Атмасфэра самай дзікай ненавісьці і гвалтаў, створаная эндэкамі на Крэсах, мусіць быць зьліквідавана.

Уканцы пасол Выгодскі бароніць заарыштаваных паслоў ад закідаў у бальшавізьме, якія

так шчодра пачаў ім першы кідаць ...„свой“ кс. Станкевіч!

Ня маем яшчэ галасоў украінскае і нямецкае прэсы ў Польшчы, дык адзначым тут яшчэ толькі літоўскі голас. Ня гледзячы на тое, што ў Коўне пануе фашыстаўская ўлада, яўна варожая імкненьням беларускіх сялян і работнікаў да сацыяльнага вызваленьня,—віленскія літвіны сваім становішчам павінны засароміць тых беларусаў, якія стараюцца ўбіць сяньня нож у сьпіну Грамадзе! Весь, што піша аб арыштах беларускіх дзеячоў „Vilniaus Aidas“ у № 7 у стацьці пад загалоўкам: „Пятыя ўгодкі“:

„Арыштаў гэных нельга назваць інакш, як ударам, скіраваным проці беларускага народу. Праўда, польская прэса адзначае, што крокі ўладаў скіраваны проці Грамады, але ня проці беларусаў. Ды толькі ворагі беларускага народу могуць казаць, быццам Грамада не зьяўляецца беларускай арганізацыяй“. (Робяць гэта ...органы сельсаюзьнікаў і хадэкаў—„нашых“! — *Рэд.*).

Прыпомніўшы, што якраз пяць гадоў назад той самы пан Мэйштовіч учыніў падобную „штуку“ з 33 беларускімі і літоўскімі дзеячамі, груба выкінутымі тады ў Літву, — літоўскі орган слушна канчае сваю стацьцю ўвагай:

„Удар гэтым пасрэдна напамінае ўсім нацыянальным меншасьцям тое, што з кожнай з іх можа стацца нешта падобнае“.

Чэха-славацкае паразуменьне.

У той час, як у Польшчы ўзаемныя адносіны між „дзяржаўным“ народам і „недзяржаўнымі“ яго меншасьцямі ўсё больш завагняюцца, калі ўвесь ратунак для Польскай дзяржавы польскае грамадзянства бачыць у мілітарнай і паліцэйскай сіле,—у найбліжэйшай саюзьніцы яе—Чэха-Славакіі—дзяржаўная праца ідзе зусім у іншым напрамку. Чэха-Славацкая Рэспубліка—пасьля банкруцтва нацыяналістычнае палітыкі яе—галоўную ўвагу зьвярнула на тое, каб абаперці сваю дзяржаўную сілу на дабрабыце і свабодзе ўсіх грамадзян—бяз розьніцы нацыянальнасьці, ды на вартасьці для іх самой новай дзяржавы. Таксама, як і Польшча, і Чэха-Славакія ня мае нацыянальна-аднолькавага насяленьня, але складаецца, ня лічучы драбнейшых групаў, — з чэхаў, славакаў і немцаў. У круглых лічбах — чэхаў каля 7 мільёнаў, немцаў — 3 з лішкам, славакаў больш, як 2.

Чэха-Славацкай Рэспубліцы прышлося—побач з іншымі дзяржаўна-гаспадарчымі задачамі — вырашыць і справу нацыянальнай кансалідацыі краю. Як немцы, таксама і славакі, былі спачатку страшэнна варожа настроены да пануючай ролі чэхаў у Рэспубліцы. Немцы, зразумела, цягнулі да Нямеччыны, не жадаючы падпарадкавацца культурна-ніжэйшаму за іх славянскаму народу. Славакі, якіх чэхі ашукалі, сьпярша абяцаўшы ім амаль ня поўную дзяржаўную аўтаномію, заеліся на сьмерць проці чэхаў, рыхтуючыся да паўстаньня ды навет — адарваньня ад Чэха-Славацкай дзяржавы.

Але дзяржаўна-палітычны розум кіраўнікоў Рэспублікі знайшоў абарону ад хатняе вайны ня ў гвалтах над „антыпаньствовымі“ імкненьнямі сваіх грамадзян, а — у паразуменьні з імі. І вось, некалькі месяцаў назад чэхі ўжо трыумфавалі з прычыны поўнага паразуменьня з сваімі ўнутранымі немцамі, якое было папярэджана дыпляматычным паразуменьнем з Нямеччынай — у Лёкарно. У выніку паразуменьня два міністры-немца заселі ў урадзе Рэспублікі, прытым — зусім не як „міністры для спраў нямецкай меншасьці“, але — атрымаўшы вельмі важныя і адказныя партфэлі агульна-дзяржаўнага значэньня. Напрыклад, немец у Чэха-Славакіі назначаны—міністрам справядлівасьці. Гэтым чэхі наймацней загарантавалі свае граніцы з Нямеччынай.

Як-жа далёка гэта ад палітыкі Польшчы, дзе толькі цяпер паўстала, дый то — далёкая яшчэ ад рэалізацыі, думка зрабіць асобнага... „віцэ-міністра для спраў усіх меншасьцяў“! Дый нельга сумлявацца, што гэтае становішча бязумоўна займе паляк...

А вось цяпер у дзяржаўным жыцьці Чэха-Славацкае Рэспублікі, пачалася „новая эра“, як пішуць краёвыя газэты: „адбылося паразуменьне з Славакамі“.

Славацкія аўтанамісты паразумеліся з чэскімі цэнтралістамі, і ў выніку паразуменьня—ізноў два міністры-славакі ўвайшлі ў склад ураду Рэспублікі. А ў той самы час у Польшчы Украінскае Аб'яднаньне ўсіх буржуазных партыяў нядаўна — на сваім кангрэсе — заявіла, што „разглядае ўсе польскія справы, як справы вонкавыя міжнародавыя“, што-ж да адносінаў між польскім грамадзянствам і беларускім народам, дык аб іх красамоўна кажуць апошнія падзеі ў нашым краю, выклікаўшыя далейшае і глыбейшае завагненьне ўзаемных адносінаў між імі.

Варта тутака прыпомніць, што павадыр славацкіх людоўцаў Глінка быў доўгі час „антыпаньствоўцам“ і рэвалюцыянерам—проці выключнага панаваньня чэхаў у краі. Ён запраўды езьдзіў за граніцу шукаючы там дапамогі проці чэхаў... Ён запраўды рабіў навет проці іх „аружныя паўстаньні“, падымаў сялянства на бунт „проці законных уладаў, пастаўленых чэхамі, якія ашукалі славакаў, ды пагвалцілі свае абяцанкі саюзьнікам у Вэрсалі. — Глінка сядзеў, ды здаецца няраз, — у вастрозе. Дый — ці-ж ён адзін?!

Але, наскольки мы ведаем, ня было выпадку, каб чэшскае грамадзянства ў сваёй прэсе, дый у сваіх урадавых камунікатах зрабіла-б з гэтага шчырага, ідэйнага народнага павадыра і з іншых „рэвалюцыйных аўтанамістаў сэпарытыстаў“, (гэта-ж значыць — незалежнікаў-паўстанцаў!) нейкіх „зладзеяў“, „шпіёнаў“, „бандытаў“, „чэкістаў“, „забойцаў“ і т. п. — дзеля таго, каб апраўдаць перад „апініяй“ заграніцы і краю — расправу з павадырамі ўцісканага народу і барацьбу з народным рухам славакаў... Можна весьці барацьбу, навет вайну з праціўнікам. Але заўсёды трэба памятаць, што — ці то з пераможаным, ці з пераможнікам — трэба пасьля будзе так ці інакш жыць у суседстве... Дык перадусім — не трэба рабіць маральна немагчымым гэтае сужыцьцё.

Дакананае паразуменьне чэхаў з славакамі, зьдзейсьніўшае іх мірнае сужыцьцё і супрацаўніцтва ў аднэй дзяржаве — на супольную карысьць, даводзіць, што з боку мацнейшых чэхаў гэта „маральная граніца“ барацьбы з слабейшымі ня была пяройдзена..

„Наш Голас“, адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць дапамагаць сваей газэце.

Важныя заявы Брыяна.

У прамове сваёй на паседжаньні камісіі для заграначных спраў францускага парляманту Брыян—ў справе перагавораў з немцамі аб фортыфікацыях на ўсходзе Нямеччыны—паміж іншым заявіў:

„Мы чакаем цяпер новых прапазіцыяў з боку немцаў, ня губляючы надзеі, што паразуменьне можа быць дасягнута да 1 лютага“. (Калі да паразуменьня ня дойдзе, тады справа будзе перадана ў Лігу Народаў, дзе Нямеччына можа цягнуць яе неабмяжаваны час!—Рэд.).

З далейшага працягу прамовы відаць аднак-жа, што Брыян прадбачыць якраз тое, што справа будзе аддана Лізе Народаў, бо—відаць, дзеля ўспакаеньня Польшчы— даводзіў, што Кантроль Лігі Народаў над збраеньнямі Нямеччыны будзе ані ня горшы, чым кантроль міжсаюзнай Камісіі.

Паводле тэлеграмы паўурадавага нямецкага агенцтва, над заявамі Брыяна ў Камісіі ўзьнялася гарачая дыскусія, у часе якой Брыян быццам змушаны быў раскрыць усе карты—сваей ігры—між Нямеччынай і Польшчай. Вось зьмест гэтай вельмі цікаўнай тэлеграмы:

„Толькі цяпер сталася ведамым, што ў дыскусіі справа нямецкіх крэпасьцяў на Усходзе (проці Польшчы.—Рэд.) іграла цэнтральную ролю.

На запытаньне, ці француска-нямецкае збліжэньне не пярэчыць француска-польскаму саюзу, Брыян адказаў: „Гэта-ж зусім розныя справы“. Ён думае, што Польшча можа таксама зусім добра паразумецца з Нямеччынай, як і Францыя.

На запытаньне, ці Штрэзэман гутарыў з ім аб неабходнасьці перагляду ўсходніх граніцаў (Нямеччыны), Брыян адказаў: Гутарыў. Тады-ж ён дадаў, што пытаньне толькі ў тым, якую канпэнсацыю (заплату, ці замену) дадуць немцы Польшчы за зьмену граніцы (пакуль-што справа йдзе толькі аб Гданскі калідор—Рэд.); што-ж датычыць да француска нямецкага паразуменьня, дык яно пусьціла такія глыбокія карэньні ў Нямеччыне, што ніводзін ўрад ня можа ад яго адмовіцца.

Левая француская прэса вельмі здаволена перамогай Брыяна над Пуанкарэ ў Радзе Міністраў.

Экспозэ Брыяна—гэта выражэньне перамогі „палітыкі Лёкарно“ (гэта значыць паразуменьня з Нямеччынай — коштам Польшчы. Рэд.).

Паміж іншым, Брыян заявіў, што — „ўсходнія саюзьнікі Францыі (чытай: Польшча і Чэхаславакія), зусім даволены яго палітыкай. А калі прэса гэтых дзяржаў выяўляе некаторую трывогу, дык гэта — дзеля агітацыі кампаніі антылёкарністаў.

Як ведама, „кампанія“ гэная ў Польшчы—вельмі значная: амаль ня ўся прэса!

Сойм і Урад.

Агульная дыскусія над бюджэтам.

У Сойме распачалася агульная дыскусія над бюджэтам.

Характэрна поўнае „незацікаўленасьць“ у гэтай расправе з боку ўраду. Ня было ў Сойме ані старшні Рады Міністраў, ані ўсяго габінэту ў поўным складзе, як гэта ўвайшло ўжо ў „закон-звычай“ усіх парляманцкіх краёў. Толькі некалькі міністраў. Навет сам аўтар бюджэту ня выступіў у абарону свайго твору—з дакладам аб агульным стане дзяржаўнай гаспадаркі. Ён мае абмяжавацца толькі прамовай, датычучай свайго міністэрства фінансаў, баронячы ў сваім часе яго бюджэт.

Эндэкі—проці камуністаў.

Клюб эндэкаў падаў ў Сойм прапазіцыю ў справе выдачы паслоў—гэткага зьместу:

„З увагі на распаўсюджаньне камуністычнай акцыі, пагражаючай дзяржаве і сацыяльнаму парадку ды падтрымліванай суседнімі дзяржавамі, дзяржаўнай неабходнасьцю зьяўляецца безадкладнае прыняцьце закону проці камунізму“.

У канцы клюб заяўляе, што дзеля хуткасьці мае апрацаваць і падаць у Сойм уласны праект, а пакуль што прапануе, каб Сойм прыняў гэткую пастанову:

„Урад заклікаецца ў працягу 14 дзён апрацаваць і прадставіць Сойму праект закону проці камунізму“.

Чуткі аб пераменах у складзе ўраду.

„Роботнік“ даносіць аб чутках, якія ходзяць у справе пераменаў у складзе габінэту. Быццам мін. унутраных спраў докт. Складкоўскі мае быць назначаны міністрам спэцыяльна створанага міністэрства Публічнага Здароўя; на яго мейсца міністрам унутраных спраў мае быць назначаны мін. Мэйштовіч, на асаблівыя таленты якога вельмі разьлічае ўрад у часе правядзеньня набліжаючыхся выбараў...

У Польшчы.

Рэзалюцыі Цэнтралі Прафэс. Саюзаў.

Цэнтраля Прафэсіянальн. Саюзаў Польшчы на паседжаньні 18 студзеня прыняла цікаўную рэзалюцыю—наступнага зьместу:

1. Цэнтральная Каміс. Прафэс. Саюзаў сцьвярджае, што палітыка сучаснага ўраду—варожая інтэрэсам работніцкай клясы. Падтрымліваючы інтарэсы вялікіх прамыслоўцаў і абшарнікаў, урад дапусьціў да нячуванага ўзросту дарагоўлі ў краі—у працягу апошняга году на 40 працэнтаў; — адначасна — згодна з воляй працадаўцаў — працівячыся рашуча падвышцы платы працаўнікам.

Наміма сваіх абяцаньняў захаваць сацыяльныя здабычы работніцкай клясы, урад пазваляе працадаўцам масава ламаць работніцкае заканадаўства (аб 8 гадзін. дні працы і г. д) — у такой меры, як гэтага не зрабіў ніводзін з папярэдніх урадаў. Гэткі стан рэчаў—паміма фальшывых запэўненьняў урадавай прэсы—значна пагоршыў палажэньне работніцкай клясы.

Дзеля таго Цэнтраля Праф. Саюз. заклікае ўсіх работнікаў да падрыхтаваньня барацьбы за падняцьце заробкаў, якое б выраўняла ўзрост дарагоўлі, а таксама за нятыкальнасьць работніцкага заканадаўства, за працу і апеку для безработных і г. д.

2) Цэнтраля Пр. Саюз. сцьвярджае, што ўрад рабіў спробы ўзалежніць ад сябе работніцкі рух, а перадусім—прафэс. арганізацыі работнікаў. Шляхам масавых рэпрэсіяў ды іншых спосабаў, часта вельмі падобных... да подкупу, часам шляхам пашырэньня розных фальшывых вестак сярод работніцкай клясы праз выдаваныя за ўрадавыя грошы нібы то „работніцкія“ часопісі,—урад стараецца забясьпечыць сабе ўплывы на Праф. Саюзы ды адарваць іх ад ідэалаў сацыялізму.

Сцьвярджаючы ўсё гэта, Цэнтраля перасьцерагае работнікаў перад пагражаючай небясьпекай з боку гэткай акцыі ўраду, маючай на мэце—разьбіцьцё адзінства работніцкага руху ды яго зламаньне...

Чуткі аб стварэньні міністэрства нацыянальных меншасьцяў.

У палітычных колах Варшавы ходзяць чуткі, быццам мае быць створана новае мі-

Ляо-Дзе.

Вароны і Каршуны.

(К А З К А).

У адным мейсцы зямной кулі, дзе ад веку расьлі і растуць высокія прыгожыя лясы, ды шумяць шырокія рэкі, — рос маладзы высокі прыгожы яловы лес. Не адзін раз вясною і восеньню ляцелі над гэтым лесам розныя птушкі ў вырай і з выраю, садзіліся часамі на дрэвы аддыхаць, але скора ізноў яго пакідалі і ляцелі ў далекі край шукаць лепшага месца, а лес ізноў аставаўся пусты.

Сумна й абідна стала лесу гэтаму быць вечна пустым бяз ласкі й прывету, без гавору птушак і іх шчабятаньня. І пачаў ён стагнаць ужо на долю цяжкую сваю, як раптам чуець у паветры ўзмахі крыльляў. Радасна зашумеў лес сваімі вярхамі, вітаючы новых гасьцей. Іх было ня многа—усяго некулькі штук. Вялікія, шэрыя з чорнымі плямамі на крылах і чорнымі дзюбамі, яны былі ня надта прыгожыя, але і ня брыдкія.

— „Вароны“, шапнула адна ёлка аднэй.

— „Варона—птушка не благая, яна не каршун і чужой працай ня жыве“,—адказала ёй тая.

А вароны тым часам пакружыліся над лесам, аглядаючы яго згары, пасьля селі на вярхох дрэў і, штосьці грагаючы, радзіліся; пасьля з вярхоў пералезьлі ўніз — у самую гушчу лапак, пабывалі і на зямлі, узноў сеўшы на вярхах, штосьці радзіліся і грагалі і наастатку паляцелі назад.

— „І гэтыя паляцелі“ — прашаптала якаясь ёлачка з жалем.

— „Ніхто нас ня любіць“,—дадала сумна іншая.

— „Не бядуйце,—вернуцца“, прагаварыла трэцьця. „Я падслухала іх гаворку — яны гаварылі, што тут не благое месца на гнёзды“.

— „Няўжо“? спыталіся радасна некулькі ёлак.

— „А вось глядзіце!“—кіўнула ім тая-ж самая ёлка ў адказ сваей галавой на паўдзён.

З паўдня з крыкам ляцела цэлае стада варон. Пакружыўшыся трохі над гушчарам, апусьціліся яны на дрэвы, нарадзіліся, ды, падзяліўшыся на пары, рассыпаліся каторая куды, выбіраючы сабе дрэвы на гнёзды.

Гушчар быў вялікі, а пар ня так многа, і кожная пара выбрала сабе на гняздо тое дрэва, якое ей найбольш падабалася. Закіпела праца. Ад рана і да вечара знасілі вароны ў гушчар валасьсё і мох, зьбіралі пруткі і хвораст ды строілі з гэтага ўсе сабе гнёзды. У гэтай рабоце яны забываліся навет аб ядзе і толькі час ад часу, як ад слабасьці пачне цямнець тэй ці іншай у вачох — скочыць яна кудысь на ральлю, глыне якіх двух-трох чарвякоў і ўзноў за работу.

— „Чаго вы так мучыцеся“?—спытаўся іх шпак, што якімсьці прыпадкам трапіў ў гушчар.

— „Нічога, наша-ж праца дарма не прападае“, адказываюць яму вароны. „Мейсца тут ціхае, добрае, нікім не занятае і дрэў пустых у запасе многа—будзе дзе і дзяцём гнёзды парабіць. Вось і застанёмся мы тут жыць на заўсёды“.

І вароны сапраўды заселі ў гушчары не на жарт.

Ішлі гады за гадамі, а вароны гушчар ня кідалі. Палятуць куды-небудзь, пажыруюць і ізноў у гушчар—бліжэй да гнёздаў, якіх з кожным годам станавілася ўсё болей і болей. Тут ім было, відаць, найлепш. Навет сярдзітая зіма з сваім страшным голадам не магла іх выжыць згэтуль: паляціць некалькі штук кудысь ў горад, пабудзе там дзеньдва, ды ізноў у свой гушчар бліжэй да гнязда, дзе іх ніхто не палохаў.

Аднак і на варон прыйшла скора бяда. Сталася гэта вясной, калі вароны, цешучыся з сваіх маленькіх дзетак, рассыпаліся па полю шукаць для іх жыру—чарвякоў, жукоў і г. д. У гушчары прыпадкова былі ўсяго дзьве ці тры вароны, што прынясьлі яду дзецям. Скаражніўшы свае клюнкі, хацелі яны ўжо адляцець за сьвежымі чарвякамі, як раптам пачуўся ў паветры якісьці сьвіст і шум і на гняздо, што было на самым высокім дрэве, зваліўся каршун, што праўда ня надта вялікі, але і не малы. Пакуль вароны надумаліся, што, ім рабіць, схапіў каршун у кожную лапу варанё, узмахнуў разоў некалькі крыльлямі і ўцёк.

Сьведкі-вароны паднялі крык, на які сабраліся ўсе вароны, але было ўжо позна.

Пакружыліся вароны над лесам, пакаркалі ды і паляцелі шукаць ізноў яды для дзяцей.

У гушчары засталіся толькі гаспадар і гаспадыня нешчасьлівага гнязда, у якім асталося цяпер усяго двое варанят.

Вараняты каршуну падабаліся. Не прахадзіла і дня, каб ён не адведаў яловага гушчару і не сьцягнуў з якогась гнязда хоць адну штуку маладых варон.

А тут за аднэй бядой і другая прышла: недалёка ад гушчару завялася ў дуплі-куна. Вароны падабаліся і ёй, і яна таксама пачала хадзіць у гушчар красьці варон і яйкі.

Відзяць вароны, што кепская справа, і далей гэдак жыць ня можна. Сабраліся яны ўсе ў адну кучу і давай радзіцца. Радзіліся, радзіліся і пастанавілі ляцець усей гурбай і раскідаць каршуновае гняздо, а яго самога абабіць, а калі ўдасца, то і крыльлі яму паламаць.

Убачыўшы цэлае стада варон, каршун кінуў свае гняздо і даў драла. — толькі яго і бачылі. У гнязьдзе засталося ўсяго двое малых каршунят.

— „Забіць іх“!—грагнула якаясь маладзейшая варона.

— „Ашалела ты, ці што“? Чым яны вінаваты, што іх бацька такі злодзей і разбойнік!“,—грагнула на яе якаясь старая.

Рашылі наастаку гняздо раскідаць, а каршунят забраць у палон і гадаваць разам з варанятамі. Так і зрабілі.

Прыляцелі каршуны на свае старое гнязьдзішча—ні дзяцей, ні гнязда.

— „Бяда не вялікая“, кажа каршун. „Гняздо мае было ня моцнае—часовае і мы скора зробім новае яшчэ лепшае“.

— „Толькі ня ў гэтым месцы“!.. крычыць на яго каршуніха: бо адгэтуль далёка лятаць на жыры. Калі ўжо рабіць новае гняздо, то вун там у гушчары, недалёка ад вароньняга табарышча“.

— „Праўда твая“, адказывае каршун. „Зьвіўшы там гняздо, можна заўсёды скарэй і ня так заўважна пажывіцца якойсь варонай“.

Вось і пасяліўся каршун ля самага вароньняга табарышча.

А тут і ў самым табарышчы ня ўсё было чыста: падгадаваныя маладыя каршуны, замест зьбіраць на полю чарвякоў ды жукоў, пачалі лётаць красьці курчанят. Каб-жа рабілі гэта толькі самі, бяда-б была невялікая, а то яны панавучалі зладзейства і маладых варон.

Замест зямлі—„крэдыты на паляпшэньне грунтаў“.

Міністар Зямельных Рэформ сказаў у Варшаве на адной урачыстасьці прамову, у якой нарысаваў праграму ўрадавай палітыкі ў справе „выкананьня зямельнай рэформы“. Паміж іншым міністар сказаў:

„Польшча ў вялікшай сваей частцы — сельска-гаспадарчы край. Дзеля таге свой бюджэт павінна апіраць перадусім—на разьвіцьці земляробства. Падстава гаспадарчага жыцьця Польшчы—зусім не вялікія капіталы, а наадварот—дабрабыт дзяржавы апіраецца ў нас на шырокіх сялянскіх масах. Гэтыя масы становяць галоўную крыніцу рабочай сілы і ядро насяленьня Краю. Заможнасьць селяніна, нашага галоўнага спажыўца, гэта ж—расцьвет нашага гандлю і нашай прамысловасьці, нашых местаў, нашай вытворчасьці—наагул багацьця дзяржавы. — А калі так, дык першым заданьнем дзяржавы зьяўляецца гаспадарчы ўздым сялянства, на дабрабыце якога датаго-ж павінен апірацца і ўнутраны парадак, як і вонкавая сіла Польшчы.—Бо-ж польскі жаўнер—гэта-ж на дзьве трацінi селянін“.

Слушна. Але—што-ж п. міністар хоча даць гэтаму селяніну, каб забясьпечыць дабрабыт, спакой унутры ды мір вонках для Польскай дзяржавы? — Можа зямлю гэтаму беззямельнаму хлебаробу? Не: пакуль—што толькі—„крэдыты на абарот і паляпшэньне грунтаў“. Міністар „зямельных рэформаў“ у вельмі хітрай форме, але выразна, радзіць малазямельнаму ды беззямельнаму сялянству—„весьці больш інтэнсыўную гаспадарку“ на сваіх шнурох; гэта значыць—класьці ў яе... капіталы. Радзіць не ганяцца за зямлёй—бо-ж гэткая „экстэнсыўная гаспадарка“ дае толькі дэфіцыт, ці страты.

Як „лёгка“ дастаюцца гэткія крэдыты селяніну, ня нам тут пісаць!

Нядаўна п. міністар земляробства Незабытоўскі казаў, што з зямлёй для беззямельных трэба пачакаць: бо-ж сьпярша трэба даць школу—навуку, як карыстацца „рэнтоўна“ зямлёй, а пасьля „крэдыты“ — на „інтэнсыўную гаспадарку“ на гэнай зямлі, што будзе дадзена пасьля... І толькі ўканцы—ўжо бясспрэчна трэба даць зямлю беззямельніку.

Цяпер мін. Становіч кажа ўжо толькі аб крэдытах.—Відаць, беззямельнаму сялянству ужо польскі ўрад навуку даў.

міністэрства—„нацыянальных меншасьцяў“, а ў кожным разе, калі не міністэрства, дык — становішча асобнага віцэ-міністра для спраў меншасьцяў. Гэты „пад-сэкратар“ меў бы падпарадкавацца беспасрэдна Прэзыдыуму Рады Міністраў. Пакуль гэтая справа будзе канчальна вырашана, зараз-жа мае быццам быць назначаны спэцыяльны „чыноўнік для асаблівых даручэньняў“ пры Прэзыдыуме Рады Міністраў, які мае весьці ў сваім дэпартамэньце ўсе справы меншасьцяў. Есьць быццам ужо і гатовы кандыдат на гэтае месца, ведама-ж—вайсковы: палкоўнік Славэк, знаны пілсудчык. Ен-жа мае пасьля быць і віцэ-міністрам.

Што азначае гэта ўсё: ці лагаднейшы курс, ці наадварот—цьвярдзейшы, аб гэтым трэба парадзіцца—у гадалкі!

Вызваленец — сябра ўраду.

Ведамы пілсудчык, пасол Вызваленьня МедзінЬскі, назначаны міністрам Пошт і Тэлеграфу.

Пэпээсавец пас. Дыямацд аб урадзе Пілсудскага—у нямецкай газэце.

У галоўным органе нямецкай сацыял-дэмакратыі пас. Дыямацд (ППС) надрукаваў цікаўную стацьцю — аб урадзе Пілсудскага, ды аб асобе апошняга.

„Пілсудскі, гэта — не Мусоліні і ня Ленін, ані павадыр сацыялізму: Пілсудскі—гэта асаблівы твор асаблівых польскіх сацыяльных і палітычных варункаў. Польская рэакцыя мае вельмі многа супольнага з спосабамі ўрадаваньня Пілсудскага. Яна хоча дасягнуць далейшых сваіх крайніх мэтаў: абмяжаваць парлямантарызм, скасаваць вольнасьць слова і прэсы, сфальшаваць дэмакратычнае выбарнае права, вярнуць даўнейшую ўладу клясе капіталістаў. Новы ўрадавы курс аблягчае рэакцыі гэтыя яе імкненьні“.

Далей аўтар таксама дэлікатна кажа, што на старане рэакцыі ў гэтым яе ўзаемным братаньні з урадам—усе выгады без усялякай адказнасьці; на старане ўраду—уся адказнасьць,—бо ўрад —„ліе ваду на млын рэакцыі“. „Дзеля таго становішча дэмакратыі ў Польшчы—вельмі труднае“.

Але далей раптам нешта ўжо зусім несподзеванае: „Барацьба Пілсудскага з крайняй рэакцыяй тупіць аружжа проці яго з боку сацыялістычнай апазіцыі“... Вось—вось: той-жа самы Пілсудскі адначасна—і „ліе ваду на млын рэакцыі“, аблягчае ей яе забойчыя для дэмакратыі крайнія імкненьні, і адначасна—вядзе з крайняй рэакцыяй барацьбу, змушаючы тым самым да злагоджаньня „сацыялістычнай апазіцыі“, якая ў асобе ППС, як падчырківае аўтар, зьяўляецца амаль што не—„адзінай дэмакратычнай партыяй у Польшчы, аб якой варта гутарыць“...

Як бачым, сам павадыр ППС сцьвярджае ў бэрлінскай газэце, што для ППС існуюць—два Пільсудскія! Сцьвярджае тым самым і тое, што ёсьць—два твары і ў самых пэпээсаў...

У канцы аўтар слушна сцьвярджае небясьпеку самаўладных рухаў Пілсудскага, якім у яго акружэньні няма ніякай процівагі: гэтае „акружэньне Пілсудскага“, якое мае цяпер усю ўладу ў Польшчы верыць толькі — „у шчасьце, у зорку Пілсудскага“, але забываецца аб тым, што Пілсудскі ня будзе-ж жыць вечна“...

Заграніцай.

Маскоўская „Правда“ аб арыштах беларусаў у Польшчы.

Як паведамляюць варшаўскія газэты, маскоўская „Правда“ піша, што арыштамі беларускіх дзеячоў і разгромам Грамады Пілсудскі, які падрыхтоўвае ваенную авантуру проці СССР, маніцца „супакоіць Крэсы“, каб—на выпадак вайны — мець—тутака забясьпечаны тыл для сваей арміі. Дзеля таго ў Варшаве пастаноўлена — задушыць беларускі рух, які—з увагі на ягоныя сымпатыі да СССР — быў-бы значнай перашкодай для ваенных плянаў Пілсудскага проці СССР.

Маніфэст Партыі Цэнтру.

Партыя Цэнтру выдала Маніфэст, на падставе якога, як праграме будучага ўраду, канцлер Маркс мае весьці перагаворы з іншымі партыямі.

Маніфэст перш за ўсё прызнае асновай Нямецкай Дзяржавы — Вэймарскую рэспубліканскую Канстытуцыю, выступаючы гэткім чынам — проці думкі аб адбудове манархіі. Далей, пасьля ведамых усім лёзунгаў „хрысьціянскай дэмакратыі“, Маніфэст заяўляе, што партыя будзе імкнуцца да — „поўнай тэрытарыяльнай свабоды Нямеччыны, да звальненьня Надрэнii ад акупацыі і да далейшага ўтрыманьня палітыкі паразуменьня з „саюзьнікамі“ (Лёкарно)“.

А ў сьвеце бывае заўсёды так, што, калі адзін баран нягодны, то кажуць, што і ўсё стада паршывае. Заслылі вароны на вёсцы зладзейкамі. Як толькі якая дзе пакажацца па двары ці гародзе, яе зараз ганяюць а то і забіць стараюцца.

Бяда настала воронам, ды і толькі: з аднаго боку куна, з другога каршун, у самым табарышчы ўжо зладзеі, — і рабі тут, што хочаш!

Сабраліся вароны і радзяць аб сваім горы, а тут адкуль ні вазьміся каршун: падляцеў ціхенька да іх сеў на ёлку, ды слухае.

— „Каршуна трэба забіць спачатку, ён слабейшы за куну“—кажа адна варона.

— „А памоему куну трэба спачатку прагнаць, а тады за каршуна ўзяцца“,—кажа іншая.

— „Дурні вы ўсе“, кажа ім раптам каршун. „Паслухайце, што я вам скажу“.

Аглянуліся вароны і затрасьліся ад злосьці, убачыўшы каршуна.

— „Біць яго“!.. крычыць адна.

— „Якта біць? Ен-жа нас цяпер не чапаець“!..—крычыць іншая.

— „Трэба паслухаць, што ён нам скажа“!—крычаць вароны-зладзейкі.

А хітры каршун, спакойна апусьціўшы клюнку, сядзеў на дрэве і толькі ціха шаптаў:

— „Справа ваша — я да вас з радай, а вы хочаце—слухайце, хочаце—не. Мне ўсёроўна“.

Пасьля доўгага крыку рашылі наастатку вароны паслухаць, што скажа ім каршун. І вось ізноў паселі вароны спакойна на дрэвы і пачалі слухаць, што ім скажа каршун.

Хітра ўсьміхнуўся каршун, паправіў дзюбай свае скрыдлы і пачаў да іх такую гутарку:

— „Маніў-бы, каб сказаў, што я не рабіў вам шкоды. Але бачыце—і вы мне зрабілі шкоду. Дык ці варта нам і ўспамінаць аб іх?—што ўжо прайшло, тое травой парасло. Пагаворым лепш, як далей жыць“.

— „Ен добра кажа,—шапнула адна варона-злодзей.

— „А як прыгожа“! — каркнула другая зладзейка.

— „Не перашкаджай слухаць“!.. каркнула чуць жывая якаясь старая варона.

— „Я, бачыце, надумаўся вас больш ня трывожыць, а жыць з вамі ў дружбе“.

— „Праўда“? — спыталася зьдзіўлена якаясь варона, паківала недаверчыва галавой і дабавіла: „Штосьці мне ня верыцца“.

— „І мне ня верыцца... і мне... і мне“... начуліся адусюль галасы.

— „Ня верыце—ня трэба, але я праўду кажу“,—гаварыў хітры каршун далей. „Але, я надумаўся, што нам каршунам з вамі ня вадзіцца і ваяваць, а памірыцца трэба, трэба разам жыць і разам бараніцца ад агульнага ворага“.

— „Ну, ты ўжо хоць і мані, ды гладка, а ня гэдак вірутна“... адсекла яму вялікая варона. „Скажы ты, хто наш агульны вораг“?..

— „А ты ня ведаеш?.. ха-ха-ха... Вось дык сапраўды дурная варона... А аб куніцы ты забылася?—Яна ня толькі ў вашы гнёзды лазіць, але і ў мяне дзяцей крадзе“.

— „Нашто ты нам здаўся ў суполку бараніцца ад куніцы?.. Ты лепш, калі сапраўды хочаш з намі жыць добра, то ня лазь у нашы гнёзды, а ад куніцы мы і самі адбаронімся“!—адказала яму ізноў тая-ж самая вялікая варона.

— А, то вы мяне ў кумпанію прыняць ня хочаце?!. крыкнуў каршун“.—Добра, я-ж вам накажу, хто я такі: з куніцай падружуся“!.. І каршун махнуў крыльлямі і адляцеў.

Ізноў прэз. Гіндэнбург даручыў стварыць—цэнтра-правы ўрад.

Пасьля няўдачы спробы Курцыуса стварыць цэнтра правы ўрад ды спробы Маркса стварыць цэнтра левы, Гіндэнбург ізноў, але ўжо ў вельмі рашучым, амаль-што загадываючым тоне, зьвярнуўся да Маркса, выразна даручаючы яму стварэньне—ураду ад цэнтра направа, гэта значыць з нацыяналістаў.

У лісьце сваім Гіндэнбург піша.

„Спробы стварэньня ўраду выключна з партыяў цэнтру ня ўдаліся. Дзеля таге зьвяртаюся да Вас, пане канцлер, з даручэньнем—стварыць чым хутчэй урад, які-б апіраўся на большасьць буржуазных партыяў Рэйхстагу“. Далей Гіндэнбург зьвяртаецца да ўсіх партыяў парляманту з заклікам — пакінуць партыйныя спрэчкі, і памятаць толькі аб дабру бацькаўшчыны ды памагчы ўтварыць урад, які мае быць — „нацыянальным“ (агульна-дзяржаўным) і будзе бараніць інтарэсы ўсіх клясаў, у тым ліку і — работніцкай...

Становчы тон Гіндэнбурга выклікаў вялікае ўражаньне сярод буржуазных партыяў Рэйхстагу. Партыя Цэнтру, якая раней адмаўлялася ад коаліцыі з нацыяналістамі, цяпер прыняла пастанову — аб згодзе на гэта.

Тады Маркс, яе павадыр, адказаў Гіндэнбургу, што прымае яго даручэньне.

Нямецкія нацыяналісты — дарваліся да ўлады.

29. I. Гіндэнбург зацьвярдзіў склад зложанага Марксам новага ўраду.

У новым габінэце нямецкія нацыяналісты маюць аж 4 партфэлі (дамагаліся — 5!), дый пры гэтым—найважнейшыя: унутраных спраў, апрэвізацыі, камунікацыі (чыгункі) і справядлівасьці. Цэнтр мае 3 міністраў: канцлера (Маркс), мін. працы і фінансаў. Нямецкія людоўцы 2 партфэлі: замежных спраў (Штрэзэман) і краёвай гаспадаркі. 1 партфэль дастаўся баварскім людоўцам, і былы дэмакрат Гесслер захаваў партфэль „рэйхсвэру“—ці—прасьцей—ваеннага міністэрства.

Характар новага габінэту найбольш рэакцыйны з усіх ад канца вайны. Але значэньне гэткай перамены ўлады ў Нямеччыне ня вычэрпываецца ўнутранымі справамі Нямеччыны.—Новы габінэт з баявымі нацыяналістамі начале—паказуе, што нямецкая палітыка на міжнародавым полі будзе ведзена вельмі энэргічна і ўже—без усялякай маскі.

Значэньне ліквідацыі ўрадавага крызісу ў Нямеччыне.

Утварэньне ў Нямеччыне ўраду з нацыяналістамі — вельмі характэрнае для ўсяго складу міжнародавых адносінаў у Эўропе.

Удзел нацыяналістаў, проці якіх аднагалосна выступала француская прэса, націск асаблівы і паўторны на іх удзел з боку Гіндэнбурга — якраз у часе гарачага дыплёматычнага бою між Нямеччынай і Францыяй у Парыжы, ясна даказывае, што Нямеччына зусім ужо вызвалілася з-пад усялякага страху ды націску Францыі... Яна ужо на стольк сільная і вольная, што францускі ўрад ня мае навет ахвоты прабаваць — страшыць Нямеччыну Фошам... Што-ж да даўнейшых „карацельных паходаў“ ці акупацыяў, якія яшчэ так нядаўна рабіў — на выпадак непакорнасьці нямецкага ўраду Пуанкарэ, дык на гэта ўжо час прайшоў беспаваротна... Той самы Пуанкарэ, які быў тады прэм'ерам, і цепер ім зьяўляецца, але цяпер яго амаль-што зусім ня чуваць у-ва ўсей парыжскай дуэлі. Гэтага грознага калісьці Пуанкарэ хапае цяпер толькі на тое, каб інтрыгаваць проці Брыяна, які выразна стаіць — за палітыку ўступак Нямеччыне, як га — адзіную магчымую для Францыі палітыку...

Справа нямецкіх крэпасьцяў на Усходзе.

Перагаворы ў Парыжу аб зьліквідаваньні нямецкіх крэпасьцяў на Усходзе, як відаць, давядуць да паразуменьня. Паводле газэтных вестак, немцы згаджаюцца зьнішчыць толькі некаторыя найнавейшыя форты, што мала зьмяняе палажэньне. Аднак, Францыя гатова і гэтым здаволіцца дзеля ўзмацаваньня добрых адносінаў з Нямеччынай.

Ваенныя сілы Амэрыкі і Англіі ў Кітаі.

Англія мае ўжо ў Кітайскіх водах аж 35 рознай сілы ваенных караблёў. Амэрыка мае іх ужо 26, ды высылае яшчэ 17. Рыхтуецца таксама да высылкі значных сухапутных сілаў.

Яшчэ англійскія войскі—у Кітай.

Англійскі ўрад шле ды шле ваенныя караблі ды войска ў Кітай. Толькі што з Англіі высланы ў Шанхай яшчэ 4 батальёны войска (—раней выслалі 2). Адначасна англійскае міністэрства загранічных спраў заяўляе афіцыяльна, што — „усе ваенныя падрыхтаваньні Англіі ў Кітаі, як марскія, так і сухапутныя, маюць выключна абаронны характар. (!) Дзеля таго, усялякія чуткі аб нібы-то рыхтаванай ваеннай акцыі на тэрыторыі Кітаю—ня маюць ніякай падставы.

Добрая „абаронная вайна“ — на чужой тэрыторыі, дый яшчэ за 10 тысяч вёрст ад сваей дзяржавы!.. Праўда-ж — у тым, што Англія яўна рыхтуецца да ваеннага нападу на Кітай, але пакуль-што ніхто з іншых імпэрыялістычных дзяржаў ня мае ахвоты ісьці з ёй у кампаніі. — Адсюль і яе „запярэчаньні“. Англія баіцца ісьці адна, бо ня мае даволі сілы; але ня траціць яшчэ надзеі намовіць іншых. А пакуль-што—падтрымлівае хатнюю вайну ў Кітаі...

Правал англійскага пляну ў Кітаі.

Як ні старалася англійская імпэрыялістычная буржуазія стварыць коаліцыю усясьветных імпэрыялістаў дзеля супольнага нападу на Кітай ды зьліквідаваньня вызвольнага руху кітайскага народу, з гэтай агіднай працы паноў Чэмбэрленаў нічога нявыйшла, — Ані Францыя, ані Японія, ані Амэрыка не згадзіліся прыняць учасьце ў аружным выступленьні проці кантонскай арміі, ня хочучы зьвязываць свайго лёсу ў Кітаі—з найгоршым ворагам кітайскага народу—зьненавіджанай там Англіяй.

Вялікае абурэньне па ўсей Індыі выклікаў загад Англіі аб пасылцы індыйскіх войск у Кітай. Усюды адбываюцца мітынгі пратэсту.

Перагаворы Англіі з Кантонам.

Паслаўшы ў Кітай дзесяткі ваенных караблёў, Англія аднак-жа — замест вайны — пачала... перагаворы з кантонскім урадам! У часе перагавораў усё-ж такі ў Кітай ўсё прыбываюць англійскія войскі. Але гэта зусім ня страшыць кантонскіх чырвоных павадыроў, якія ня робяць англійцам ніякіх уступак, стоючы крэпка на сваім: — што ў Кітаі — адзін гаспадар: кітайскі працоўны, народ. Наадварот,—Англія ўсё больш спускае тон, як відаць з апошняй прамовы Чэмбэрлена ў Бірмінгаме. У прамове гэтай кіраўнік англійскага імпэрыялізму заяўляў, што Англія зробіць усе ўступкі Кітаю, каб толькі ён... ня гнаў англійцаў вон!

Англійскі міністар едзе да Мусоліні

Радавыя газэты пішуць, што англійскі міністар Чэрчыль, заядлы вораг бальшавікоў, мае ехаць на спатканьне з Мусоліні, каб намовіць яго прыняць учасьце у процірадавым блёку, а заадно ўжо і—проці Кітаю, дзе камандуюць, б'ючы Англію, тыя-ж бальшавікі.

За гэта быццам Англія абяцуе Мусоліні—даць вольную руку дый сваю дапамогу ў Малай Азіі.

Амэрыка згадзілася на суд з Мэксыкай.

На паседжаньні сэнату сэкрэтар для замежных спраў Амэрыкі Келлог зрабіў несподзявана заяву, што амэрыканскі ўрад згаджаецца аддаць канфлікт з Мэксыкай аб нафту ў Міжнародавы Трыбунал у Гаазе.

Перамога лібэралаў у Нікарагуа.

З Нікарагуа паведамляюць аб значнай перамозе „лібэральнай арміі над войскам кансэрватыўнага ўраду, які прадаўся амэрыканскім імпэрыялістам.

ХРОНІКА.

Прыпыненьне газэты. З прычыны таго, што дасюлешні рэдактар „Нашае Справы“ зрокся свайго становішча, а пракуратура не дапусьціла да заарыштаванага пасла Мятлы, выдаўца гэтае газэты, дзеля подпісу заявы камісару ўраду аб назначэньні за рэдактара другое асобы, — „Наша Справа“ да часу вызначэньня паслом Мятлой новага рэдактара ня можа выхадзіць.

Зацьверджаньне канфіскацыяў. Віленскі акружны суд зацьвердзіў канфіскацыю камісарам ураду № 8 „Нашае Справы“ з 10/I 1927 году і № 2 „Народнага Звону“ з таго-ж чысла. Абедзьве газэты абвінавачваюцца паводле арт. 263 К.К.

Канфіскацыі „Сялянскае Нівы“. Апошнія два нумары „Сялянскае Нівы“ сканфіскаваны паліцыяй. Гэта—першыя канфіскацыі ад пачатку істнаваньня газэты „Сялянскага Саюзу“, які быў для ўладаў вельмі пажаданым, пакуль стараўся аплёўваць Грамаду і блізкіх да яе дзеячаў. Цяпер, калі ўрад сам узяўся за адкрытую барацьбу з Грамадой, „Сялянская Ніва“ страціла ласку, і тое, што ей раней даровывалася, цяпер упісываецца ў яе рахунак, як беларускага органу, само сабой няпрыемнага для ўлады.

У Цэнтральным Сэкрэтарыяце Грамады. У памяшчэньні Цэнтральнага Сэкрэтарыяту паліцэйская варта ўжо зьнята.

Як нас паведамляюць, за час працы Цэнтральнага Сэкрэтарыяту паступіла на рукі яго звыш 12 тысяч злотых, як чацьвёртая частка сяброўскіх складак, пасыланая з збораў гурткоў у Цэнтралю. Гэтак агулам гурткамі сабрана сяброўскіх складак да 50.000 злотых. Дык дзіўнымі выдаюцца гутаркі аб нейкіх „тысячах даляраў“, выдаваных быццам-та на „платных агентаў“ Грамады.

Працаўнікі Цэнтральнага Сэкрэтарыяту атрымлівалі ў месяц ад... 75 зл. да 120!

Вобыск у адваката Родзевіча. 21-га студзеня паліцыя ў Вільні зрабіла вобыск у кватэры ведамага адваката Вацлава Родзевіча, які ў апошнія часы даволі часта выступаў, як абаронца, у палітычных працэсах.

Гэтае пагвалчэньне прафэсіянальнае тайны адвакатуры выклікала сярод адвакатаў глыбокае абурэньне і пратэсты.

Проці гэтага новага гвалту і зламаньня істнуючага ў Польшчы закону аб шанаваньні прафэсіянальнае тайны адвакатаў віленская рада адвакатаў паслала рашучы пратэст да міністра справядлівасьці. І вось тут — асаблівая пікантнасьць: як сцьвярджае „Kur. Wil.“, загад зламаць закон даў... сам-жа міністар справядлівасьці,—той, хто павінен бараніць закон ад ламаньня!

Зьвяга ня спыняецца. Нейкая цёмная рука, якая праз услужную польскую прэсу сее нягодную ілжу аб беларускіх дзеячох і арганізацыях, каб апраўдаць процізаконны арышт беларускіх паслоў, — далей пхае ў польскія газэты ілжывыя весткі. Гэтак, абвясьціўшы, быццам адзін з дырэктароў Белар. Кaaп. Банку, сьвяшч. Коўш, які ад 1921 году не выяжджаў з сваей парахвіі ў Ваўкавыскім павеце, быў „начальнікам чрэзвычаек“ у СССР у 1923 і 1924 гадох, — гэная самая рука закідае Грамадзе забойства не й

кага Смоліка пад Вялейкай. У сувязі з гэтым заарыштаваны камітэт тамтэйшага гуртка. Добры спосаб выкарыстываць кожны крымінал — дзеля палітычных мэт!

Вываз палітычных вязьняў. Як падаюць варшаўскія газэты, гэтымі днямі ўлада вывезла з Вільні ў вастрог у Станіслававе (ў Галічыне) трынаццаць палітычных вязьняў, прымаўшых учасьце ў апошняй галадоўцы вязьняў на Лукішках. Сярод вывезеных—Арсень Канчэўскі, Мікалай Шыла і рад іншых беларусаў.

Сьмерць Камісара Ураду Вімбора. Надовячы, пасьля апэрацыі сьляпое кішкі памёр Камісар Ураду на м. Вільню Вімбор.

Лекцыя грам. Луцкевіча. Адложаная з прычыны хваробы лектара перад Калядамі лекцыя грам. Ант. Луцкевіча на тэму: „Уступленьне ў беларускую літэратуру“ — адбудзецца ў гэту суботу ў 7 гадз. увечары ў салі Т-ва Беларускае Школы (сьв. Анны 2).

Лекцыю ладзіць Цэнтральны Гурток Т-ва.

Спэктакль-вечарына. У суботу, 29-га студзеня адбыўся спэктакль-вечарына Навасьвецкага Гуртка Таварыства Беларускае Школы ў памешканьні Віленскае Беларускае Гімназіі. Пастаўлены былі дзьве камэдыі: 1) „Пасланец“ і 2) „Модны Шляхцюк“; пасьля—скокі пад духавы аркестр.

Даход пайшоў на культурна-асьветныя мэты.

Крызіс валакністае прамысловасьці. У Беластоку, галоўным цэнтры валакністае прамысловасьці нашага краю, з прычыны адсутнасьці заказаў прыпынілася праца ў гэткіх фабрыках сукна: Герца (95 работнікаў), Шміdта (35 раб.), Шляхтара (22 раб.) і Шварца (40 раб.).

Дзеля тых-жа прычын спынілася праца ў фабрыцы Пэрэцкага і Геняцкага ў Васількове, дзе працавала 240 работнікаў.

Высьненьне ў справе спыненьня караў за лясныя шкоды. Камісар ураду на м. Вільню аналяшчае, што загад Прэзыдэнта Рэспублікі з 30-га лістапада 1926 году аб прыпыненьні караў за лясныя шкоды на адзін год (ад 1-га сьнежня 1926 году да 30-га лістапада 1927 году), калі праступкі былі ўчынены да 22-га студзеня 1922 г., сяляне часта тлумачаць няправільна, бачучы ў гэтым як быццам дапушчэньне на час цэлага году бяскарнасьці лясных парубак і г. п. Камісар высьняе, што сказаным загадам Прэзыдэнта ў гэткіх выпадках кара адкладаецца толькі на працяг аднаго году і дароўваецца, калі засуджаны на яе ў працягу гэтага аднаго году ня зробіць новага праступку. Калі-ж праступак паўторыцца перад канцом году, дык вінаватца будзе караны і за новае, і за старое.

Скасаваньне дробных нядоімкаў. Урад выдаў загад, каб дробныя нядоімкі да аднаго злотага, якія асталіся пасьля пералічэньня нядоімкаў у марках на злотыя, былі скасаваны.

Як ведама, такія дробныя сумы дагэтуль асабліва пільна спаганяліся з нашых сялян, пры чым кошты экзэкуцыі часта былі ў некалькі разоў вялікшыя, чым сама нядоімка з карамі і працэнтамі.

Староста пад судом. Былы беластоцкі староста Зыгмунт Кміта за прысваеньне ў 1921 годзе 3 мільёнаў марак, асыгнаваных на дапамогу вярнуўшымся бежанцам, засуджаны апэляцыйным судом у Варшаве на 4 гады папраўчага вастрогу. Адначасна суд пастанавіў спагнаць з яго 4.000 злотых.

Афіцыяльны курс грошы на 25-га студзеня. Даляр — 8 зл. 95 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

25.I. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,96. Зал. р. 4,70 зл. Чыр. 3 дал. 90 цэн.

З Радавае Беларусі.

Усебеларуская студанцкая канфэрэнцыя.

Перад мінулымі Калядамі ў Менску адбылася трохдзённая ўсебеларуская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва. На канфэрэнцыі была каля 100 дэлегатаў.

Студэнцтва адзначала дрэннае матар'яльнае палажэньне студэнтаў і слабае правядзеньне ў жыцьцё новых мэтадаў выкладаньня.

З дакладаў высьнілася, што Цэнтральнае Бюро аб'ядное на Беларусі каля 10.000 чалавек. З іх каля 5.000 атрымоўваюць стыпэндыі.

Лекарскі агляд студэнтаў паказаў, што амаль 50 проц. студэнтаў—хворыя. Лекавыя патрэбы студэнтаў абслугоўваліся толькі на 10 проц.

Апошні прыём у Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт (Б.Д.У.) даў моладзь значна лепш падрыхтаваную, чым прыёмы мінулых гадоў.

Было адзначана паляпшэньне культурнай працы сярод пралетарскага студэнцтва. Студэнты Беларусі прынялі актыўны ўдзел у ліквідацыі няпісьменнасьці сярод жыхарства.

Студэнты Б.Д.У. абслугоўвалі каля 200 ліквідацыйных пунктаў, а студэнты сельска-гаспадарчай акадэміі арганізавалі ў вёсках шмат с.-г. гурткоў, праводзілі даклады і гутаркі ў хатах-чытальнях і народных дамох.

Адным з недахопаў зьяўляецца слабае разьвіцьцё фізычнае культуры сярод студэнтаў.

Выступаўшыя студэнты падкрэслівалі такжа слабае правядзеньне культурнае працы сярод самых студэнтаў.

Канфэрэнцыя скончылася выбарамі новага Ц.Б., у якое ўвайшло 15 чалавек.

Усячына.

Абрацовая анархія.

Польская газэта „Głos Prawdy“, орган пілсудчыкаў праводзіць анкету на тэму: „які палітычны лад найбольш адказывае розуму і характару сучаснага грамадзяніна Польскай Рэспублікі“.

Адзін з удзельнікаў анкеты даводзіць, што найбольш адпаведным ладам для Польшчы зьяўляецца анархія, якая ўжо навет ёсьць у Польшчы, толькі трэба было-б яе ўдасканаліць.

„Мы, палякі,—кажа ён,—зусім не зьмяніліся за гады, якія аддзяляюць нас ад эпохі, калі з гордасьцю было казана: „Polska nierządem stoi“ (Польшча на бязладзьдзі стаіць). Тады гэта называлася бязладзьдзем, сягодня ж навука гэта называе анархіяй.

Калісь была ў Польшчы шляхоцкая анархія—сягодня шляхоцка-жыдоўская і, калі-б не цяжкія эканамічныя часы, дык ніхто-б і не наракаў. Бо анархія і ёсьць як раз ідэальнай палітычнай атмосфэрай для паляка.

I памыляўся б той, хто думаў-бы, што гэта атмосфэра адпавядае толькі дрэнным грамадзянам, лаўцом рыбы ў мутнай вадзе. О, не!

Далей кажа: „Але-ж Панове! сяньня маем тыповую анархію, толькі бяз гвалтаў вулічных, за тое-ж вельмі каштоўную, бо бюрократычная адміністрацыя глытае шмат грошы (па за падаткамі). Ці-ж ня лепш называць рэч сваім імем і замест таго, каб думаць аб папраўцы рэспубліканізму, спыніцца над удасканаленьнем анархіі?

Бо анархія сяньняшняя выгадная толькі некаторым (заможным і прытасаваўшымся), а ўсё-ж такі павінна служыць усім“.

Канчае свой адказ аўтар так: „Хочам мець добрых грамадзян? Дамо-ж ім лад безаглядпай вольнасьці, а не якуюсь пастаянную арэштанскую, да якой трэба прыраўняць нелады сучаснай Эўропы.

З жыцьця Горадні.

Няўдаўшыся спэктакль.

На дзень 15 студзеня Горадзенская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы ладзіла ў салі клюбу жыдоўскіх рамесьнікаў спэктакль-вечар; мелі паставіць жарт у 1 дзеі „Пасланец“, пасьля якога праектавалася дэклямацыя вершаў беларускага паэты Янкі Купалы і інш. Аднак, дзеля незалежных ад Управы прычынаў (уноч з 14 на 15 студзеня артысты былі паліцыяй заарыштаваны, і звольнілі іх толькі 15 у 12 гадзіне ўночы), спэктакль і дэклямацыя не маглі адбыцца, аб чым і даводзіць Управа да ведама грамадзян м. Горадні.

Сэкрэтар Акружнай Управы
Зм. Кулакоўскі.

Пробная трывога.

Уноч з 21 на 22 сьнежня быў зроблены алярм у 81 палку пяхоты. Усе жаўнеры гэтага палка былі пастроены ў поўнай баявой гатоўнасьці на пляцу перад казармамі. У горадзе зараз пайшлі чуткі, быццам чакалі беларускае дэманстрацыі з прычыны арышту паслоў.

Карэспандэнцыі.

Дзеяч Сялянскага Саюзу.

(Наваградчына).

Наш багатыр сялянскага саюзу п. Рагуля быў 7-га сьнежня 1926 г. у м. Любчы, Наваградзкага пав., і раздаваў свае прамовы; 8-га сьнежня у м. Негнявічах, Наваградзкага пав., і вельмі хваліў свой Сялянскі Саюз і ўсіх заклікаў у сваю арганізацыю. Але нашы грамадзяне ня далі шмат і гаварыць, кругом зьбілі з дарогі п. Рагулю, які, бачучы, што нічога ня зробіць, уцёк з памешканьня грам. Орсы. Пабачыў ён і пачуў, што людзі пазналі і пераканаліся, гдзе праўда і які адзіны шлях да вызваленьня з пад уціску, ды, што ня ўдасца іх павясьці па той дарозе, якую намячаў п. Рагуля, разьяжджаючы ў лапцях ды сярмязе ў 1922 годзе. Мусіць народ пазнаў усе гэтыя штучкі. Хаця і ёсьць яго староньнікі, як-та: грамадзяне з м-ка Негнявічы, Рыгор Орса, Васіль Кашур, і з в. Папгур'я гэтай гміны, Янка Пяцэвіч і Аксэнці Сіўка, каторыя надта агітуюць за Сялянскі Саюз, але нашы сябры іх адусюль гоняць, як здраднікаў.

Наднёманец.

Беларускі тэатр у Вялейцы (павятовай).

Як шчыра вітаюць на вёсцы ўсё сваё на роднай мове—можна бачыць на такому прыкладу:

19-га сьнежня м. г. грамадзяне вёскі Сакавічы, Куранецкае гм., папрасілі вялейскую беларускую трупу прыехаць і паставіць спэктакль у іх вёсцы. Абяцалі зрабіць усё магчымае ад іх, але толькі каб прыехалі.

I праўда. Прыехаўшы ў Сакавічы, мы проста зьдзівіліся. Падмосткі зроблены з перагародкі, якая на гэты час была разобрана. Кулісы і заслона з даматканых пасьцілак, ад варот да дзьвярэй дарожка абсаджаная ёлачкамі. Гэта як прыклад усім вёскам, што пры ахвоце і арганізаванасьці можна ўсё зрабіць, на першы погляд, немагчымае.

Згулялі: „Калісь“ і „Зьбянтэжаны Саўка“, гулялі досыць добра. Недахваты былі—ня цьвёрда знал ролі, але гэтаму прычынай — раптоўнасьць пастаноўкі.

Глядзельнікі былі задаволены, прасілі яшчэ прыехаць. Пасьля спэктаклю адбыліся скокі, на якіх сябра Каляда Аляксандар вучыў вясковую моладзь, скакаць лявоніху. Падчас скокаў іграў Вялейскі струнны аркестр, але ня ў поўным сваім складзе і вясковая музыка— цымбалы гармонь.

Ні гаспадар хаты, ні кабета за мёд, якім яна частавала артыстаў, ні за падводы нічога ня ўзялі.

Чэсьць Сакаўцам, як разнасіцелям Беларускага мастацтва і культуры. Даход у суме 41 зл. 70 гр. пайшоў на адбудову народнага дому ў Вялейцы.

Другая паншчына.

(Наваградчына).

Вучыцель Уладыслаў Чакуля Лозкаўскае школы, Шчорсаўскае гм., Наваградзкага павету, вельмі зьдзекуецца з нашых беларускіх дзетак; проста катуе, б'е беспашчадна, на калені ставіць, ганяе, як якіх салдат і др. Гэткія фокусы выробляе над дзяцьмі, кажучы: „я вам холеры покажэ бялоруску школу, бэндзеце паментаць“! Дзеці вельмі баяцца яго, як якога зьвера, і ня хочуць ісьці ў школу, але што зрабіць, калі аштрафуюць бацьку ці маці, калі ня пойдзе. Дык вось як гэтыя культурнікі—вучаць нашых дзетак!

Наднёманец.

Бедны солтыс.

(Наваградчына).

У вёсцы Вераскаве, Любчанскай гм., Наваградзкага ваяводзтва, увесь час быў солтысам Б. Абрантовіч. Праўда, былі перавыбары і абабралі другога і паслалі пратакол у гміну, але войт сказаў, што ня добрага выбралі і што прыедзе сам. Калі прыехаў войт, дык вёска, каб ужо дагадзіць яму, выбрала самага першага прыслужніка панскага, як і старога солтыса. Сам войт сказаў, што, цяпер-та будзе новы солтыс, але ўжо прайшло гадоў са два, а солтыс той самы. Цяпер стары солтыс сам нярад, што застаўся, бо вельмі шмат працы. Днём-та нічога, але тут прыходзіцца і ўночы быць на нагах, гэтаму віна гурткі.

Наш бедны солтыс, аж наблажэў, і нат' дастаў катару, бо, ведама ж, цэлую ноч гэткім марозам стаіць у вёсцы пад вокнамі, хаця каб гдзе не сабраліся грамадзісты. У нас у вёсцы ёсьць хат пяць беларусаў каталікоў; а наш солтыс атрымоўвае дарэмна „Dz. Wil.“. і там ён вычытаў паход проці Грамады, дык ён нагаварвае гэтых беларусаў каталікоў пашкодзіць грамадзе. А сам, бачыўшы, што грамадзіст хлопец вясковы, і мала ведае законы, навет кажа, што ён мае права арыштаваць кожнага грамадзіста, але з яго ўсе сьмяюцца і пытаюцца, колькі яму ганарару дае „Dz. Wil.“ за гэта.

А. Сьценьна.

Нам пішуць з вёскі што:

× Ксёндз пробашч А. З. з амбоны і ўсялякімі іншымі спосабамі стараецца адстрашыць грамадзян беларусаў Вішнеўскай гм., Вялейскага павету ад усяго беларускага асабліва-ж ад беларускіх „бальшавіцкіх“ газэт, замест якіх дарма раскідае польскія газэты. Нядаўна ў Вішнеўскай гм. адбылася перапісь (якая?), у якой ня трэба было на'т запісываць прозьвішча, а толькі казаць, хто якой нацыянальнасьці. Ня гледзячы на ўрадовую агітацыю—беларусы усё-ж такі ўзялі верх.

× Солтыс в. Залацеева, Дэрэчынскай гм., Слонімскага пав. Сліж Тамаш вельмі спалохаўся перавыбараў солтысаў па ўсей гміне і ўсімі сіламі стараецца падлізацца панам Данілевічам (з суседняга маёнтку) і паліцыі. Ён робіць розныя фальшывыя даносы на змагароў за родную школу, якія масава складаюць і ўсіх тых, хто імкнецца да арганізацыі беларускае працоўнае гушчы, спадзяючыся, што апошнія дадуць яму магчымасьць утрымацца і на далей солтысам. Ганьба яму—прадажніку аднасяльчан!

× Вішнеўскі поп Павал Макарэвіч (Валожынскі пав.), калі прышла да яго сялянка Аміля Мартыновіч з в. Ганчароў па мэтрыку—запрасіў ад яе 40 зл. Сялянка пачала праеіць, каб ён зьніжыў крыху. Але поп сказаў: „Калі ня маеш грошы—то ідзі зарабі і тады прыдзі па мэтрыку, а я ня жыд і таргавацца са мной ня можна. Сялянка ўсе-ж стаяла на сваім і вытаргавала мэтрыку за 4 злоты. У папа Вішнеўскага цэны без запросу!

× Грамадзянін В. Юша, ідучы з работы, дагнаў сялян Янку і Вінцука Вялькоўскага з вёскі Вярцішы, Вішнеўскае гм. і сказаў ім: „здарова беларускія сяляне!“ Але яны адказалі, што хутка такога беларуса ў турму насадзяць, што Беларусі ніколі ня было і ня будзе, а такія, што называюць сябе беларусамі, не вядома скуль узяліся. Абодва, як відаць, набралі ў свае дурныя галовы абшарніцкіх думак і выракаюцца свайго роднага. Гэта пасьля таго, як яны купілі па 2 гектары сенажаці, пачалі сябе залічаць да абшарнікаў. Ганьба рэнэгатам, здраднікам свайго народу!

× Кс. Я. Войдак страшыць сялян Вішнеўскае гм. з амбоны, што не пайдзе па калядзе ў тыя вёскі—гдзе ёсьць беларускія гурткі. А сяляне і рады, бо ня трэба будзе траціць часу на спатканьне ды і каляднага ня трэба будзе даваць яму.

× Войт Вішнеўскае гм., Пякарскі Янка навучыўся скуру дзёрці ў бедных людзей. Служыў у яго Адвард Каранеўскі, які ня мае нідзе жаднага прытулку. Раз удалося яму злавіць двух шашкоў і прадаць, дык войт хацеў адабраць грошы за шашкоў у Каранеўскага, а калі той адмовіўся аддаць грошы—прагнаў яго са службы.

× Лясьнічы Картуз Бярэзкага надлясьніцтва Сакалоўскі заявіў, „ня дам дроў праклятым беларусам. толькі палякі ў мяне дастануць дроў. I таго, што сказаў, прытрымоўваецца. Толькі той з беларусаў атрымае дроў—хто прыслужыцца вяльможнаму пану лясьнічаму.

× Гмінная Рада гм. Нягневічы Наваградзкага павету толькі і знае, каб сьцягаць з сялян больш падаткаў ды хабароў, каб пагуляць ды добра напіць гарэлкі, а аб народзе то нічуць ні паруляцца. Толькі знаюць добра служыць панам. Напрыклад пісар гміны Грацкі з войтам Горбачыкам, што хочуць, ніпуць ці робяць, а рада гмінная слухае. Наш радны Янка Макаравіч з в. Аўдзевічы хваліўся, што з сойміку з Наваградка ішлі 2 дні, а да Наваградка ўсяго 18 кілямэтраў, мусіць добра загулялі нашы радныя ў Наваградзкім сойміку.

× Абшарнік з двара Хоўхла з Гарадоцкай гм., Маладэчанскага пав. Уладзімер Чайкін выкінуў на вуліцу бедную Юзэфу Хацімскую, якая служыла ў яго за кухарку ў працягу 8 лет і так верна, што нават абараніла яго ад сьмерці, адабраўшы рэвольвер, калі пан хацеў застрэліцца.

× Васіль Калядзюк, сярмяжнік наш, жыхар вёскі Лаўрушава, гм. Негнявіцкае стаіць за паноў і гэтым самым здраджае сваіх таварашоў сярмяжнікаў.

× У вёсцы Мархачоўшчыне, Сьвержанскае гм., Стаўпецкага павету наладжаны быў 9 студзеня спэктакль-вечар. Паставлены былі п'есы: „Птушка Шчасьця“ і „На вёсцы“. Гулялі вяскоўцы самі, і згулялі вельмі ўдачна. Трэба пажадаць мархачоўцам вялікага пасьпеху ў іх добрых пачынаньнях!

× Моладзь вёскі Субачы Крывіцкае гм., Вялейскага пав., замест таго, каб хоць штось рабіць дзеля арганізацыі і асьветы нашага цёмнага сялянства, каб у сьвята наладзіць разумную гульню, прачытаць кніжку, або газэту—робіць бойкі, у якія б'юць адзін другога, чым папала. Асабліва вызначаецца ў гэтых бойках Ануфраёнак. Ці ня стыдна вам хлопцы? Адумайцеся.

Рэдактар-Выдавец: Альберт Эйсак.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.